ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ЧАЦВЕР
12
СНЕЖНЯ
№ 31—32
(1694—1695)

САКРЭТ ФІРМЫ

Тэлефон даверу

для студэнтаў пачаў работу ў Пярмі. Па аўторках і чацвяргах з 16 да 18 гадзін студэнт можа падзяліцца з прафесіянальным псіхатэрапеўтам усімі сваімі бедамі і праблемамі. Наколькі нам вядома, у Мінску існуе тэлефон даверу, але няма такога, які б спецыялізаваўся на студэнцкай тэматыцы. Цяпер праблема вырашана. Вы можаце зняць трубку хатняга тэлефона, набраць лічбу 8, дачакацца доўгага гудка, затым 3422-32-71-80 і падзяліцца клопатам, а магчыма, атрымаць кваліфікаваную параду.

Трэст студэнцкіх сталовых

горада Варонежа, на першы погляд, зрабіў студэнтам падарунак — у студэнцкіх сталовых цэны на прадукцыю не павышаліся. Але, як апынулася, толькі на першы погляд на цэннік. Пасля ж трапезы страўнікі ў многіх трывожна заверашчалі: «Малавата будзе!»

У выніку высветлілася — цэны ранейшыя, але разы ў паўтара-два паменшаны аб'ём порцый. Раптам не заўважыце!

З 1 студзеня 1991 года

студэнтам, бачна, прыйдзецца плаціць поўны кошт чыгуначных і авіяцыйных білетаў. Калі ў самы бліжэйшы час Дзяржадукацыяй не будуць прыняты адпаведныя меры, то ільготны праезд для студэнтаў, як і многае іншае, кане ў Лету, заявіў упаўнаважаны чыноўнік гэтай установы Аляксандр Цягін.

Адухоўленая дабрачын насць

Спецыялістаў польскай мовы і літаратуры пачаў рыхтаваць Гродзенскі універсітэт імя Я. Купалы. Тут адкрытыя польска-беларускае і польска-рускае аддзяленні. Кафедры актыўна супрацоўнічаюць з ВНУ Рэспублікі Польшча, абменьваюцца спецыялістамі ў галіне мовазнаўства і культуры, праводзяць міжнародныя канферэнцыі.

Многія польскія філолагі ахвотна дапамагаюць новым кафедрам універсітэта. Напрыклад, пенсіянер з Рэспублікі Польшча Станіслаў Гушча на грамадскіх пачатках збірае і прывозіць у Гродна кнігі на польскай мове, метадычныя распрацоўкі.

Падайце беднаму прафесару

Апытанне, праведзенае ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, паказала, што 83 працэнты выкладчыкаў лічаць сваю заработную плату неадпавядаючай працоўнаму ўкладу. На пытанне аб тым, колькі грошай яны хацелі б атрымліваць, большасць анкетуемых адказалі — у тры разы больш. Калі ўлічыць, што гэта сума ўжо зараз выплочваецца многім работнікам прамысловых прадпрыемстваў, дык папракаць дацэнтаў і прафесараў у раскошы ніяк нельга. Сёння яны маюць патрэбу ў сацыяльнай абароне, як і многія іншыя нашы грамадзяне. Таму злабадзённыя праблемы вышэйшай школы сталі прадметам размовы ў Дзяржаўным педагагічным інстытуце імя М. Горкага на пасяджэнні камітэта сацыяльнай абароны. Ён быў створаны ў сакавіку гэтага года перад «паўлаўскім» павышэннем цэн. Цяпер, калі рэспубліка стаіць на парозе новага інфляцыйнага скачка, калі падае сацыяльны статус інтэлігенцыі, расце недавер да афіцыйных прафсаюзаў, члены камітэта лічаць неабходным рэспубліканскі орган, які аб'яднаў бы выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў і аспірантаў усіх ВНУ рэспублікі, дапамог ім абараніць свае сацыяльныя правы.

Бартэр нам дапаможа

Вучоныя 8 кафедр Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута падпісалі дагавор са многімі калгасамі і арэндным прадпрыемствамі Мастоўшчыны.

Яны прапануюць сялянам канкрэтную тэхналогію па вырошчванню пэўных сельгаскультур, па ўходу за глебамі і жывёламі. Заказчык, у сваю чаргу, плаціць.

Праўда, сяляне адразу ж папярэдзілі вучоных, каб рэкамендацыі іх былі канкрэтнымі, а не звыклай «ліпай».

СЕСІЯ!!!

Пакуль не ў студэнтаў, а ў дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Чатырохмесячны марафон, на працягу якога лёс КПСС—КПБ знаходзілася ў падвешаным стане, нарэшце, завершаны. 10 снежня прынята рашэнне аб аб'яўленні уласнасць рэспублікі рухомай і нерухомай маёмасці, якое належыла КПСС—КПБ, уключаючы грашовыя сродкі ў рублях і валюце.

Фота С. ГРЫЦА.

ДОШКА АБ'ЯЎ

Савет маладых навукоўцаў Белдзяржуніверсітэта аб'яўляе конкурс на лепшую навуковую работу сярод маладых навукоўцаў БДУ за 1992 год.

Конкурс праводзіцца па двух напрамках: у галіне прыродазнаўча-тэхнічных і гуманітарных навук. Для пераможцаў конкурсу ў кожным з напрамкаў прадугледжана прэмія памерам 500 рублёў.

З правіламі афармлення работ можна пазнаёміцца ў І. Ганчаронка (пакой 484 фізічнага корпуса) ці ў М. Каневіча (пакой 134 галоўнага корпуса).

Апошні тэрмін прадастаўлення работ на конкурс — 1 сакавіка 1992 года.

НУ І НУ!

Чорт спакусіў...

РАБОТНІКІ мінскіх кніжных магазінаў вельмі занепакоены шматлікімі крадзяжамі друкаванай прадукцыі. Бясследна знікаюць дзесяткі, нават сотні экземпляраў... Асабліва часта гэта здараецца ў тых гандлёвых кропках, дзе адкрыты доступ да таго, што ёсць на паліцах. Прадаўцы вымушаны не толькі абслугоўваць пакупнікоў, але і напружана сачыць за рухамі кожнага з іх.

Згодна з маімі даследаваннямі, часцей за ўсё крадуць у кніжным магазіне «Мастацтва». Цікава і тое, што ў гэты ж магазін найбольш часта вяртаюць крадзенае па ўласнай ініцыятыве. Відаць, тут абслугоўваюцца найбольш «сумленныя» злодзеі...

Найбольш рэдкія крадзяжы ў «Доме ваеннай кнігі». Гэта і зразумела — магазін наведваюць у асноўным афіцэры штаба КБВА, які знаходзіцца побач. Але бываюць і выключэнні. Прыйшоў у мінулым годзе ў Дом ваеннай кнігі ветэран вайны і працы Віктар Валодзін. І так спадабалася яму кніга Ю. Тынянава «Смерць Вазір-Мухтара», што не ўтрымаўся ад спакусы... Схаваў кнігу пад падшэўку пінжака, дзе некалі, магчыма, захоўваў партыйны білет. Але незаўважна для прадаўцоў гэтыя дзеянні не прайшлі. Украдзеную кнігу ветэрану не падарылі, хоць ён і «адкрыў сезон» крадзяжоў. Дырэктар магазіна Віктар Пруднікаў вырашыў, што злодзей павінен быць пакараны. Той жа растлумачыў свае паводзіны проста: «Чорт спакусіў...»

У магазіне № 6 быў затрыманы на выхадзе мужчына, які спрабаваў вынесці зборнік вершаў. Ён, як высветлілася,— кандыдат навук, загадчык аддзелам... Што ж тады казаць пра дзяцей, якія вельмі прафесійна крадуць прыгожыя календарыкі і дапаможнікі па адзінаборствах?

І ўсё ж найбольш часта сустракаюцца сярод злодзеяў у кніжных магазінах людзі сацыяльна неадапцірааныя: бомжы, наркаманы і г. д. Такім чынам яны зарабляюць свае грошы.

Работнікі магазінаў бачаць два шляхі выратавання: наймаць прыватных дэтэктываў ці часцей звяртацца ў сродках масавай інфармацыі да насельніцтва з заклікамі аб сумленні. Але хто слухае сёння парады і заклікі, няхай сабе і разумныя?...

А. ГУСАК.

Прапануем вам інтэрв'ю, якое даў карэспандэнту «Звязды» В. ЧАРНЯЎСКАМУ рэктар Міжнароднага вышэйшага Сахараўскага каледжа па радыеэкалогіі кандыдат фізіка-матэматычных навук Аляксандр ЛЮЦКО.

Аляксандр Люцко:

«Рэтушаваць вострыя праблемы не збіраемся»

Факт стварэння Сахараўскага каледжа, ды яшчэ і міжнароднага, да таго ж, менавіта ў Мінску сам па сабе ўжо выклікае шэраг пытанняў. Адсюль, лічу, самым правільным будзе перадаць ініцыятыву вам. З чаго б вы пачалі, Аляксандр Міхайлавіч?

— Неабходнасць стварэння такога каледжа вельмі наспела. Усур'ёз пытаннямі радыяцыйнай бяспекі ў свеце пачалі займацца ў канцы другой сусветнай вайны, асабліва — пасля Хірасімы і Нагасакі. Дабавіла клопатаў сусветнаму супольніцтву і будаўніцтва АЭС, аварыі, якія на іх адбыліся — ва Уіндскейле (Вялікабрытанія), Санта-Сюзане (ЗША), на навуковадаследчым рэактары ў Югаславіі і ў іншых месцах. Усюды там пацярпелі людзі.

Ва ўсім цывілізаваным свеце даныя па аддаленых выніках апраменьвання старанна збіраліся і вывучаліся. Кожны, хто атрымліваў павышаную дозу радыяцыі, быў пастаўлены на ўлік. Доўгія гады, да самай смерці чалавека, за ім назіралі вучоныя і медыкі. (У нашай краіне, аднак, рабілася не так, а чаму — скажу пазней). Адным словам, за многія гады матэрыялаў набралася шмат, былі падлічаны каэфіцыенты радыяцыйнай рызыкі ракавых і іншых захворванняў, генетычных вынікаў апраменьвання і г. д. Усяго ў свеце налічваецца 930 тысяч такіх пацярпеўшых — і да кожнага праяўлена ўвага, гуманны падыход.

— Прабачце, але чаму ж адразу пасля чарнобыльскай катастрофы мы не выкарысталі ўсе гэтыя даныя і вопыт?

— Таму што паслячарнобыльская сітуацыя аказалася зусім іншай, і ўсе раней распрацаваныя каэфіцыенты могуць быць прыменены тут толькі ў невялікай ступені. Чарнобыль жа — буйнейшая ў гісторыі чалавецтва катастрофа, непараўнальная ні з чым па маштабах уздзеяння на экалагічнае асяроддзе. А ўзяць атамную трагедыю на Урале, якая адбылася ў 1957 годзе? Яна ж па сутнасці з'яўлялася ланцугом аварый, якія амаль бесперапынна ішлі адна за адной. У гэтых выпадках мы маем не разавыя ўздзеянні радыяцыі, а пастаяннае, доўгатэрміновае, пры параўнальна невялікіх дозах апраменьванне — праз паветра, ваду, забруджаную глебу, ежу.

Так што неабходных даных у тыя дні нам яўна не хапала. Вучоныя АН Беларусі, Белдзяржуніверсітэта адразу задумаліся: як ратаваць насельніцтва? Праявілі цікавасць да гэтай праблемы і навуковыя аўтарытэты Захаду. Аднак ці лёгка было пры адсутнасці дастатковай базы змагацца з сумна вядомай 35-бэрнай канцэпцыяй, з яе ўсемагутным тады вяшчальнікам Ільіным і яго камандай? Беларускія вучоныя і сёння пакуль не змаглі пераканаўча даказаць міжнароднаму супольніцтву правільнасць сваіх поглядаў — зноў жа з-за недахопу неабходнай інфармацыі.

У гэтай справе адчуваецца яўнае супраціўленне міжнародных атамных ведамстваў, структур нашага і іншых ваенна-прамысловых комплексаў, якія не зацікаўлены ў данясенні наяўных даных на суд грамадскасці. А іх яны, між іншым, за многія гады накапілі дастаткова. Я неаднаразова выязджаў у замежныя навуковыя камандзіроўкі, працаваў у саставе беларускай дэлегацыі на перадапошняй Генеральнай канферэнцыі МАГАТЭ, выступаў таксама ў

якасці эксперта. І пераканаўся: вакол чарнобыльскіх праблем — шмат усялякіх палітычных гульняў. Але гэта патрабуе асобнай размовы...

Статыстыка ў нас недакладная, проста ілжывая. Ліквідатары, турэмныя зняволеныя, якія калісьці змагаліся з кыштымскай аварыяй на Урале, у ёй наогул не існуюць, яны быццам «выпарыліся» з рэальнага жыцця.

Вось тыповы дыялог з адным з чарнобыльскіх ліквідатараў: «Што ты ведаў аб радыяцыі, калі цябе, васемнаццацігадовага, паслалі на дах рэактара?» — «Тое, што напісана ў школьным падручніку». А там, заўважце, апісваюцца доследы Рэзерфорда, якія тым кожнаму прызначаў лічбу па прынцыпу»: Іваноў працаваў добра — яму запісвалі 5 бэр. Сідараў рабіў горш — яму 3 бэры». Гэтыя «даныя» потым трапілі ва ўсесаюзны рэгістр. Што гэта, як не фальсіфікацыя, злачынства перад людзьмі і навукай? Да таго ж, шмат інфармацыі проста страчана.

— Кваліфікуем прыведзеныя факты як яшчэ адзін прысуд нашай бязлітаснай адміністрацыйнай сістэмы. Які, аднак, кантраст: у цывілізаваным грамадстве кожны з амаль мільёна пацярпеўшых знайшоў дзяржаўную падтрымку, а ў нашай краіне людзей па-ранейшаму «спісваюць» тысячамі, чыноўнікі выганяюць ліквідатараў-расіцеляў з кабінетаў, здзекуюцца з іх...

— Супраціўленне было, і вельмі адчувальнае. Летам гэтага года ў Маскве праходзіў першы Міжнародны кангрэс памяці Андрэя Дзмітрыевіча Сахарава, на якім давялося працаваць і мне. Там я і ўнёс прапанову аб стварэнні ў Мінску Міжнароднага Сахараўскага каледжа па радыеэкалогіі для вывучэння вынікаў аварыі ў Чарнобылі, а таксама для распаўсюджвання ведаў, аб удзеянні апраменьвання на навакольнае асяроддзе і чалавечы арганізм.

Чаго толькі ні рабілі праціўнікі прынцыпу міжнароднасці! Разважалі, відаць, так: уціснем беларускіх вучоных у жорсткія рамкі іх уласных тэрытарыяльных праблем, нехай яны закісняць ад недахопу інфармацыі, тады ідэя сама па сабе згасне. Распусцілі нават паклёпніцкія чуткі: маўляў, удава вучонага А. Бонэр супраць эксплуатацыі імя Сахарава. Аднак яна ўзяла слова і сказала, што вылучаную ідэю разглядае менавіта як гонар для імя і справы ўсяго жыцця Андрэя Дзмітрыевіча і для сябе асабіста. Бо ў аснову дзейнасці Міжнароднага каледжа закладваюцца тыя прынцыпы, якія спавядаў сам вучоны — навуковая кампетэнтнасць і сумленнасць, гуманны падыход да чалавека. Вось тады за праект прагаласавалі ўсе. Яго падтрымалі і многія міжнародныя арганізацыі.

Але вось што яшчэ ўразіла. У жніўні гэтага года я ездзіў у ЗША, дзе кантактаваў з вядомым ва ўсім свеце нашым пісьменнікам А. Салжыніцыным. Аказваецца, амерыканцы практычна нічога не ведаюць пра Чарнобыль, нават сам Салжаніцын (!) пра ўсю вастрыню праблем упершыню даведаўся толькі ад нас.

Там жа пачалі работу і па стварэнню міжнароднага апякунскага камітэта, які б каардынаваў усю замежную дапамогу па стварэнню Міжнароднага Сахараўскага каледжа. Старшынёй камітэта абраны прафесар Гарвардскага універсітэта Рычард Уілсан. У яго ўваходзяць многія вучоныя з сусветнымі імёнамі, грамадскія дзеячы, членамі яго сталі таксама А. Бонэр і С. Шушкевіч. Наш каледж — незалежная грамадская арганізацыя, рэтушаваць вострыя праблемы, як пажадана некаторым уплывовым колам афіцыяльных улад, мы не збіраемся.

У постчарнобыльскую эпоху радыяцыйная культура народа павінна стаць часткай агульнай культуры. Радыяцыю, калі яна прыйшла ўжо на нашую зямлю, нельга адразу знішчыць, на яе фоне прыдзецца жыць і нашаму, і наступным пакаленням. Мы пастаянна гаворым: на дзяржаву надзея пакуль слабая. Патрэбна, шчыра кажучы, арганізоўваць радыелагічны лікбез. Людзі павінны засцерагаць і самі сябе, ведаць простыя правілы радыяцыйнай бяспекі і гігіены, чым і як харчавацца.

Вось тыповы прыклад. У адной з гаспадарак калгаснікі патрабавалі ў нашай камісіі дастаўкі ім чыстых прадуктаў. З аднаго боку, іх патрабаванні былі ў многім правільныя, але з другога... Прыйшлося тлумачыць ім простыя ісціны, якіх яны не ведалі. Можна без боязі ўжываць, мясцовую садавіну. Трэба толькі выдаляць костачкі і зярняткі, паколькі радыенукліды накопліваюцца менавіта ў іх, а ў мякаці — не.

— Адным словам, грамадства атрымае ад каледжа добрых настаўнікаў, якія нас многаму навучаць і побач з якімі жыць будзе намнога спакайней?

— У школах, ВНУ ужо ёсць курс радыяцыйнай бяспекі. Аднак хто на месцах іншы раз гэтыя веды прапагандуе? Нават настаўнік фізкультуры! І гэтым усё сказана. Праўда, цяпер становішча можна пачаць выпраўляць — намі ўжо напісаны спецыяльныя падручнікі, першы з іх выйдзе ў гэтым годзе.

Міжнародны каледж па радыеэкалогіі — зусім новая форма навучання для нашага грамадства. Будзем спадзявацца, што і ў іншых галінах адукацыі возьмуць з нашай работы што-небудзь карыснае для сябе.

Паміж таталітарызмам і дэмакратыяй?

27—30 лістапада адбыўся міжнародны навуковы калёквіум «Узаемадзеянне сродкаў масавай інфармацыі, народа і інстытутаў улады ў працэсе дэмакратызацыі». Ён быў арганізаваны кафедрай сацыялогіі БДУ, сацыялагічным навукова-даследчым цэнтрам і Беларускай службай «Грамадская думка».

Сацыёлагі Белдзяржуніверсітэта займаюцца праблемамі эфектыўнасці СМІ (сродкаў масавай інфармацыі) ужо на працягу 15 гадоў. Але за гэты час пытанняў прыбаўлялася, што выклікала неабходнасць абмяркоўваць і вырашаць іх. Так з'явілася ідэя аб правядзенні міжнароднага форуму. У ім згадзіліся прыняць удзел вучоныя, якія прадстаўляюць вядучыя навукова-даследчыя цэнтры па вывучэнню сродкаў масавай камунікацыі ў ЗША, Канадзе і Заходняй Еўропе. У тым ліку прафесар М. Рабой з аддзялення інфармацыі і камунікацыі універсітэта Лаваля (Квебек, Канада), Р. Утэн, рэдактар штодзённай газеты «Уэст Франс» (Францыя), Ш. Дэларэ і М.-Н. Таранжэ, дырэктар і прафесар інстытута па вывучэнню камунікацыі універсітэта Марсель-Энэ-Праванс (Францыя), П. Льюіс, прадстаўнік цэнтра камунікацыйнай палітыкі Лонданскага універсітэта, У. Барлоу, прафесар аддзялення камунікацыі універсітэта Горварда ў Вашынгтоне, Х. Федаровіч, дырэктар інстытута публіцыстыкі і камунікацыі Зальцбургскага універсітэта (Аўстрыя), а таксама прафесар гэтага універсітэта П. Брук.

Магчыма, не ўсе праблемы, выказаныя ў дакладах замежных гасцей, падаліся зразумелымі і блізкімі нашым вучоным. Але ў будучым яны могуць стаць актуальнымі і для нашага грамадства.

Сёння застаюцца невысветленымі многія прынцыповыя пытанні, якія маюць як тэарэтычны, так і палітычны характар: СМІ — гэта інстытут таталітарызму ці дэмакратыі па вызначэнню? У чым заключаецца іх эфектыўнасць, уплыў, сацыяльныя функцыі? Ці можна лічыць сённяшнія змены ў масавай камунікацыі савецкага грамадства абарачальнымі? Здавалася б, яны сталі такімі пасля красавіка 1985 года, калі многія сродкі масавай інфармацыі ў нашай краіне ператварыліся ў авангард галоснасці і дэмакратызацыі грамадства. Але апошнія падзеі паказалі, што тыя змены мелі толькі частковы і павярхоўны характар, значыць, і абарачальны. Асабліва яскрава гэта паказаў жнівеньскі путч, калі на працягу некалькіх гадзін на большай частцы тэрыторыі краіны была ўстаноўлена амаль поўная інфармацыйная блакада, а СМІ сталі крыніцай дэзінфармацыі.

Удзельнікі міжнароднага калёквіуму не маглі, зразумела, вырашыць шматлікія праблемы існавання сродкаў масавай інфармацыі ў нашай краіне, але іх зацікаўленае абмеркаванне дапамагло больш адэкватна ўявіць шляхі вырашэння гэтых праблем, лепш зразумець адзін аднаго, пачаць дыялог аб супрацоўніцтве.

НА ЗДЫМКАХ: моманты работы калёквіуму.

Фота С. ВАСІЛЬЕВА.

Водбліск 2

ДАЙ-Д-ЖЭСТ

Як знайшоў, дык і ў торбу...

Каб дапамагчы табе, чытач, арыентавацца ў тым падабенства мора, якое ўтвараюць сабой свежавыдадзеныя кнігі, і каб ты на ўсялякі выпадак ведаў, якога скарбу пазбавіўся, штосьці не купіўшы, мы паспрабуем змяшчаць у «Водбліску» нешта накшталт рэкламнага роліка напалову з дайджэстам, дзе будзем інфармаваць пра цікавыя навіны літаратуры.

Сёння вашай увазе прапаноўваем тры кнігі, якія маюць дачыненне да філасофіі Індыі.

1. А. П. Блавацкая «З пячор і нетраў Індастана».

Купіўшы кнігу, вы рызыкуеце «забіць» адразу двух (магчыма — больш) зайцоў, бо пазнаёміцеся не толькі з Індыяй канца XIX стагоддзя, з яе гісторыяй і напаўрэальнымі легендамі, прыродай, архітэктурай (там шмат фотаздымкаў), павер'ямі, невытлумачальнымі прыгодамі і здольнасцямі індусаў, пачынаючы ад старажытнасці, але і знойдзеце цалкам чытэльную і добразразумелую індыйскую філасофію, апрацаваную і пададзеную спецыяльна для непадрыхтаваных розумаў.

На мяжы стагоддзяў людзі таксама цікавіліся спірытызмам, звышздольнасцямі ёгаў, тады таксама спрачаліся ідэалісты з матэрыялістамі і адбываліся іншыя цікавыя рэчы. Пра гэта і многае астатняе вы даведаецеся з гумарной і адначасова сур'ёзнай кнігі, якую напісала незвычайная жанчына. Пасля рэвалюцыі кніга ў нас не перавыдавалася. Купіць яе вы можаце, патрапіўшы на продаж у Ленінскай бібліятэцы. А можа, вам пашчасціць у іншым месцы.

2. Кніга Бхагвана Шры Раджніша «Жыццё. Каханне. Смех». Яе вы можаце знайсці, не выходзячы з галоўнага корпуса БДУ, або, зноў жа, у Ленінцы.

Мне заўсёды хацелася знайсці не ўдавана, а відавочна шчаслівага чалавека, шчаслівага і ў глыбіні душы, і на паверхні. Відаць, я нарэшце знайшла. Кніга Бхагвана — сведка гэтаму. Такая абаяльная і жыццярадасная да іскрыстага бляску рэч мне яшчэ не траплялася. Гэта — таксама ўсходняя філасофія, яшчэ адна канцэпцыя, далібог, вартая ўвагі. Вось некалькі цытат:

«Быць вар'ятам — значыць быць нармальным.

Свет ведаў такіх прыўкрасных, звар'яцелых людзей, і сапраўды, усе вялікія людзі на зямлі былі крыху вар'ятамі — у вачах натоўпу. Іх вар'яцтва выражалася ў тым, што яны не былі няшчаснымі, не былі знепакоенымі, не баяліся смерці, не хваляваліся аб дробязях. Кожны момант яны пражывалі поўна і інтэнсіўна, і дзякуючы гэтай паўнаце і інтэнсіўнасці іх жыццё зрабілася прыўкраснай кветкай — яны былі поўныя водару, кахання, жыцця, смеху.

Наша выхаванне пазбаўляе розум цэльнасці. Мы павінны паказваць твар грамадству, натоўпу, свету — не трэба, каб гэта быў ваш сапраўдны твар, на самой справе гэта і не павінна быць вашым сапраўдным тварам. Вы павінны дэманстраваць такі твар, які людзям падабаецца, які яны цэняць, які будзе прымальным для іх — іх ідэалогіі, іх традыцыі — і вам прыходзіцца пакідаць свой сапраўдны твар для сябе...

У той момант, калі побач прысутнічае іншы, вы менш цікавіцеся сабой, больш цікавіцеся тым, якое ў яго будзе меркаванне пра вас...

Вы ў даўгу толькі перад вашай уласнай сутнасцю. Не ідзіце супраць яе, бо гэта значыць здзейсніць самагубства, разбурыць сябе...

Тое, што смерць не можа адабраць у вас, і ёсць адзіны сапраўдны скарб, а тое, што можа быць адабрана кожным, не ўяўляе каштоўнасці, вас проста падманулі.

Толькі вашы сапраўдныя пачуцці, ваш сапраўдны вопыт будуць спадарожнічаць вам нават пасля смерці...

Ваша адзіная мэта павінна быць у тым, каб песціць і ахоўваць тыя ўласцівасці, якія вы здолееце ўзяць з сабой, калі смерць разбурыць ваша цела, ваш розум, таму што гэтыя ўласцівасці будуць вашымі адзінымі спадарожнікамі. Яны — адзіная рэальная каштоўнасць, і людзі, якія набываюць іх,— толькі яны і жывуць; іншыя толькі ўяўляюць сябе жывымі...

Лепшы спосаб прамінуць жыццё — гэта мець да яго пэўныя адносіны. Адносіны з'яўляюцца ў розуме, а жыццё існуе па-за розумам. Адносіны — гэта нашы выдумкі, нашы прымхі, нашы фантазіі. Жыццё — не наша выдумка...

Жыццё — гэта не філасофія, не праблема, яно — таінства. Вы павінны жыць, не пагаджаючыся з умовамі — з тым, што вам гаварылі пра жыццё — вы павінны пачаць нанова, са сваёй стартавай рысы.

Лепш не навешваць ярлыкі, лепш не спрабаваць надаць жыццю якую-небудзь структуру, лепш пакідаць заканчэнне адчыненым, лепш не выдумляць катэгорый, лепш не ставіць штампаў. І да вас прыйдзе прыўкрасны вопыт, да вас будзе прыходзіць усё больш і больш касмічнага вопыту, таму што ў сапраўднасці перагародак не існуе...

Не прымайце жыццё як праблему, гэта містэрыя неверагоднай прыгажосці...

Жыццё само па сабе — гэта чыстае палатно, яно становіцца тым, што вы намалюеце на ім. Вы можаце намаляваць пакуту, можаце — асалоду...»

МАНІФЕСТ

Чалавек сярод таямніц жыве, і жыццё яго таямніца вялікая ёсць... Пазнаеш, чытач? Гэта пісаў І. А. Бунін.

«Водбліск» будзе балансаваць на мяжы рэальнага.

«Водбліск» мяркуе асвятляць цьмяна-бліскучыя нетры псіхалогіі, гушчар філасофіі (нават усходняй), нетрадыцыйныя спосабы жыцця (калі трапяцца на вока — то і беларускія), а таксама погляды і пазіцыі асобна ўзятых думаючых людзей. Магчыма, будуць філасофскія ці фантастычныя мініяцюры «ад сучаснікаў», цікавыя ідэі, гіпотэзы, навіны.

«Водбліск» прызначаецца для тых, хто хоча нешта зразумець, бо адчувае ўнутраную пустэчу. Для тых, хто хоча спасцігнуць свет у розных праявах ці знайсці СЭНС у сваім недасканалым існаванні. «Водбліск» будзе ціха асвятляць звычайныя «праклятыя» пытанні, на якія адказаў звыш меры.

«Водбліск» — не ментарства, а Пошук Адказу. Тут кожны выбірае сам.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Наталля ЖУК.

НАШЫ НЬЮС

У гэтым годзе споўнілася 160 год са дня нараджэння і 100 год са дня смерці выключнай рускай жанчыны Алены Пятроўны Блавацкай (1831—1891). Вас безумоўна зацікавіць яе неверагоднае жыццё, здольнасці, а таксама вытрымкі з яе філасофскіх работ, з дарожных дзённікаў, якія вы зможаце прачытаць у «Водбліску».

* * *

Творчая моладзь Мінска мае шанц займець свой часопіс. Яго збіраецца выдаваць нядаўна ўтвораны Саюз творчай моладзі «Альтэрнатыва», які яшчэ не зарэгістраваны, не мае ўласнага памяшкання і размяшчаецца ў СШ № 119. Каб друкавацца ў часопісе, трэба мець з сабой талент ці хаця б малюнкі, прозу, паэзію. Калі вы зацікавіліся — прыязджайце пакуль не позна аўтобусам № 47 да пл. Казінца. Народ збіраецца ў СШ № 119 па суботах а 17 гадзіне.

НЕВЯЛІКАЯ ЦЫТАТА

«Мы спыніліся на зваротным шляху каля «Мудун- Маҳала» — другога беспрычыннага кур'ёза: гэта дом, пабудаваны невядома кім і дзеля чаго на вялізным акругленым валуне. Гэты камень (пэўна, родны кромлехам старажытных друідаў) ад найслабейшага да яго дотыку гайдаецца ва ўсе бакі, разам з дамамі і тымі, хто пацікавіўся ў яго залезці. Мы, канешне, пацікавіліся, і толькі дзякуючы пільнасці тых, хто хадзіў за намі, як пяшчотныя нянькі, Нараяна і бабу ды Такура захавалі ў цэласці нашы насы...

Дзіўны народ, гэтыя туземцы! Не думаю, каб знайшлася ў прыродзе гэткая штука, на якой бы яны не маглі ўсесдзець з найвялікшым камфортам, толькі перад гэтым злёгку прабалансаваўшы. Ускочыць індус на калок, на жалезную перакладзіну, крыху таўсцейшую за тэлеграфную драціну, падкорчыць пад яе ўсе дзесяць пальцаў, учэпістых і даўгіх, як у малпы, ног, прысядзе на кукішкі ды і сядзіць сабе цэлымі гадзінамі...

«З пячор і нетраў Індастана»

Усё ў Індыі, у краіне слана і атрутнай кобры, тыгра і няўдачлівага англійскага місіянера, усё своеасабліва, дзіўна; усё кідаецца ў вочы нечым нязвыклым і нечаканым нават і для таго, хто быў у Турцыі, Егіпце, Дамаску і Палестыне...

Нідзе чалавек не адчувае гэтак сваёй нікчэмнасці, сваёй слабасці, як перад велічнай прыродай тропікаў. Прамыя, як стрэлы, ствалы какосавых пальмаў дасягаюць іншы раз 200 футаў у вышыню; гэтыя «прынцы расліннага царства», як назваў іх Ліндлей, увянчаныя каронай даўгіх галін, кармільцы і дабрадзеі беднага народа; пальмы прыносяць яму і ежу, і адзенне, і жытло. Самыя высокія нашы дрэвы здаліся б карлікамі перад баньянам і асабліва перад какосавымі і іншымі пальмамі. Наша еўрапейская карова прыняла б сваю індускую сястру спачатку за цяля, а потым адмовілася б ад роднасці з ёю, бо ні мышыны колер поўсці, ні прамыя, як у казла, рогі, ні вялікі горб на спіне, не дазволіў бы ёй зрабіць такую памылку. Што тычыцца жанчын, то хаця кожная з іх здольная захапіць мастака сваімі рухамі, касцюмам, грацыяй, тым не менш, ад нашай румянай і дзябёлай якой-небудзь Ганны Іванаўны ніводная з прыгажунь Індастана не дачакаецца ні ласкі ні прывітання: «Гэта ж сорам які, даруй Божа: глядзіш — баба ж зусім голая!»...

....Патанджалі, заснавальнік адной з шасці галоўных філасофскіх сістэм старажытнай Індыі, арганізаваў містычную школу пад назвай «Школа ёгаў». Думаецца, што і неаплатонікі Александрыйскай другой і трэцяй школы былі паслядоўнікамі індыйскіх ёгаў, асабліва іх феургіі, вывезенай, па паданню, з Індыі Піфагорам. Ёсць яшчэ і сёння ў Індыі сотні ёгаў, якія засяроджана ідуць услед сістэме Патанджалі, і, калі верыць ім, яны маюць зносіны з Брамай. Аднак большасць з іх дармаеды, і хаця «жабракі» па прызванню, але махляры па прычыне ненасытнай прагі індусаў да цудоўнага. Сапраўдныя ж ёгі не з'яўляюцца публічна, але жывуць у поўнай адасобленасці і праводзяць усё жыццё ў вучобе, акрамя асаблівых выпадкаў, калі прымушае неабходнасць...

Мы ехалі з трыма знаёмымі індусамі. Два з іх былі калісьці высокай касты, зараз яны выключаны з яе і «адлучаны» ад пагады за саўдзел і зносіны з намі, вартымі пагарды іншаземцамі. На станцыі да нас далучыліся яшчэ двое сяброў— з туземцаў, з якімі мы перапісваліся з Амерыкі ўжо некалькі год. Усе яны члены нашага грамадства, рэфарматары юнай Індыі і ворагі брамінаў, каст і забабонаў, дамовіліся накіравацца разам з намі на гадавы кірмаш храмавага свята ў пячорах Пуны...

...Недзе пяць год таму (у 1874 годзе — заўвага перакладчыка) у Нью-Йорку ўтварылася таварыства адукаваных, энергічных, рашучых людзей... Заснавальнікі гэтага клуба былі людзі, якія верылі ў феномен спірытуалізма, як і ў магчымасці іншых феноменаў у прыродзе, але разам з тым адмаўлялі тэорыю пра «духаў». Людзі гэтыя глядзелі на сучасную псіхалогію як на навуку, што стаіць на самай пачатковай прыступцы развіцця, якая нічога не ведала пра «духоўнага чалавека» і пры гэтым шматлікія прадстаўнікі яе адхілялі тое, чаго не маглі вытлумачыць па-свойму.

З першых дзён існавання гэтага таварыства (Тэасофскага) да яго далучыліся многія з самых дасведчаных людзей Амерыкі. Яны адрозніваліся ў сваіх паняццях і поглядах не менш, чым члены любога геаграфічнага ці археалагічнага таварыства, якія столькі год сварыліся, напрыклад, наконт вытокаў Ніла ці егіпецкіх іерогліфаў...

«Ламы-будысты,— разважаў савет таварыства,— не вераць ні ў Бога, ні ў асабістую індывідуальнасць чалавечай душы, але яны славутыя сваімі феноменамі, а «месмерызм» (гіпнатызм — заўвага перакладчыка) вядомы і практыкуецца ў Кітаі пад назвай іна і яна ўжо шмат тысяч год. У Індыі ненавідзяць і баяцца так паважаемых спірытамі духаў, але іх звычайныя, неадукаваныя факіры робяць «цуды», якія ставяць у тупік самых вучоных даследчыкаў і лепшых еўрапейскіх фокуснікаў...

Галоўны савет нью-йоркскага таварыства вырашыў накіраваць у Індыю дэлегацыю з мэтай вывучэння на месцы, пад кіраўніцтвам санскрытолагаў, старажытнай мовы «Вед», рукапісаў і цудаў «ягаізма»... І вось 17 снежня 1879 «місія» адплыла з Нью-Йорка ў Лондан, а пасля ў Бамбей, куды і прыбыла ў лютым 1879 года...»

КНІГІ ЖЫВОЙ ЭТЫКІ ЎПЕРШЫНЮ БЫЛІ ВЫДАДЗЕНЫ Ў 20—30-я ГАДЫ НАШАГА СТАГОДДЗЯ Ў РЫЗЕ НА РУСКАЙ МОВЕ. ПОТЫМ ПЕРАВЕДЗЕНЫ НА ЕЎРАПЕЙСКІЯ МОВЫ І ХУТКА АТРЫМАЛІ ШЫРОКАЕ СУСВЕТНАЕ ПРЫЗНАННЕ, ПА ЎСЕЙ ПЛАНЕЦЕ АД ЯПОНІІ ДА МЕКСІКІ ЎЗНІКЛІ АБ'ЯДНАННІ ПА ВЫВУЧЭННЮ І РАСПАЎСЮДЖВАННЮ АСНОЎ ЖЫВОЙ ЭТЫКІ. АДНАК ШМАТМІЛЬЁННАЙ АЎДЫТОРЫІ САВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН ГЭТА ДЗІЎНАЕ ВУЧЭННЕ СТАНОВІЦЦА ДАСТУПНЫМ ТОЛЬКІ Ў АПОШНІ ЧАС.

14 КНІГ ВУЧЭННЯ ЖЫВОЙ ЭТЫКІ — СПАДЧЫНА ВЫДАТНАГА МЫСЛІЦЕЛЯ ХХ СТАГОДДЗЯ АЛЕНЫ ІВАНАЎНЫ РЭРЫХ. АГНІ ЁГА ЗРАБІЛА ГЭТУ ЖАНЧЫНУ САПРАЎДЫ БЕССМЯРОТНАЙ. А. І. РЭРЫХ ЗДОЛЕЛА ЎСПРЫНЯЦЬ І СЭРЦАМ, І РОЗУМАМ АКІЯН МУДРАСЦІ УСХОДУ, СПАЛУЧЫЦЬ З СУЧАСНЫМІ НАВУКОВЫМІ ДАСЯГНЕННЯМІ ЗАХАДУ І ПАМКНУЛАСЯ ДАНЕСЦІ ДА СУЧАСНІКАЎ ПАТАЕМНЫЯ АСНОВЫ ЖЫВОЙ ЭТЫКІ, АБО АГНІ ЁГІ.

Свет Агні Ёгі

Згодна з містычнымі вучэннямі Індыі і Тыбета, адно з самых высокіх, паважаных і шануемых панящцяў у Азіі — Шамбала. У ім увасабляюцца векавыя мары чалавецтва аб магчымасці існавання Дабра, Ісціны і Прыгажосці на Зямлі. Шамбала — духоўны цэнтр планеты. У горным масіве Гімалаяў, у аддаленні ад шумнай цывілізацыі абаснавалася спрадвеку супольніцтва Вялікіх Настаўнікаў Усходу — Гімалайскіх Махатм (у перакладзе значыць «вялікія душы»), а таксама іх бліжэйшых вучняў і спадзвіжнікаў.

Агні Ёга сцвярджае, што ўсе сусветныя патаемныя адкрыцці, рэлігіі і вучэнні, а таксама ўсе правідцы, апосталы і прарокі трымалі сувязь з Шамбалай. Недаступная злой волі і пустой цікаўнасці, Шамбала не з'яўляецца недасягальнай для чыстага чалавечага сэрца. Шлях да яе — не праз геаграфічныя, а праз духоўныя шыроты; пачынаецца ён з паўсядзённага імкнення да дабрыні і шчырасці, да высокага светаразумення, з жадання спасцігнуць таямніцы быцця. Калі кліч да самаўдасканалення становіцца асноўным жыццёвым матывам, а запаветы Вучэння рэалізуюцца ў канкрэтных учынках, пры ўмове поўнай самаадданасці служэнню ідэям Вялікіх Настаўнікаў, чалавек можа разлічваць на кантакты з Гімалайскімі Махатмамі. Згодна з Агні Ёгай, ён становіцца вучнем Белага Братэрства — садружнасці сіл святла, якія распасціраюцца ад Зямлі ў касмічную бязмежнасць.

Каб паскорыць духоўную эвалюцыю ўсяго чалавецтва, Махатмы давяраюць сусветныя ісціны сваім найбольш духоўна дасканалым вучням, навучаюць іх патаемнай Навуцы Жыцця. З цягам часу Ісціны папярэдне перададзеных людзям Вучэнняў чалавецтвам скажаюцца, і Настаўнікі праз сваіх зямных вучняў-пасрэднікаў абнародуюць новае, больш адпавядаючае планетнай сітуацыі Вучэнне. Такія зносіны выбраны не выпадкова, бо для большасці людзей Вучэнне, якое перадаецца праз пасрэднікачалавека, і больш зразумелае, і больш пераканаўчае, чым калі б Махатмы, у існаванне якіх многія не вераць, сталі павучаць самі. Свет высокіх ідэалаў — духоўная цвярдыня чалавецтва, заснаваная на ведах, што накапліваюцца доўгія і доўгія тысячагоддзі.

Спакон века прыцягваюць, вабяць да сябе людзей горы. Ужо ў самых старажытных паданнях і легендах вобраз гор гранічна звязаны са святымі мясцінамі жыхарства багоў — грэчаскі Алімп, гара Меру індусаў, японская Фудзіяма, яўрэйскі Сінай, армянскі Арарат, Эльбрус у персаў... Свет у свядомасці людзей таксама падзелены на «горны» — духоўны, і «дольны» — зямны. Снежныя вяршыні ў Новым запавеце — гэта знак набліжэння да самага Вышэйшага. Велічныя горныя масівы на Усходзе называюць ступенямі да Бога. Вучэнне Агні Ёга перадае сутнасць »горнага палёту», які звязвае фізічныя і духоўныя вышыні ў непадзельнае цэлае: «...На вяршынях зліваюцца ў адно духоўныя і цялесныя патрэбы... стыхія вогненая і паветраная ачышчае не толькі фізічную прастору, але і духоўную... «У высокіх палётах духу вечная сіла горнага прыцягнення.

Найбольш драматычныя перыяды гісторыі чалавецтва азнаменаваны з'яўленнем новых духоўных адкрыццяў. Яны не адмаўлялі цалкам папярэднія рэлігійныя і маральна-філасофскія палажэнні, а папаўнялі іх сугучным эпохе зместам. Услед за мудрасцю Старога запавета прыйшлі запаветы Хрыста, і яны вывелі вучэнне на больш высокую ступень любові і даравання, удыхнулі энергію абнаўлення. Вучэнне Жывой Этыкі звязана ніцямі пераемнасці і з усходнімі рэлігіямі, і з хрысціянствам. Эпоху, якая надыходзіць, вучэнне называе эпохай трыумфу Ісціны Прыгажосці або «Эрай Агню».

Сімвал «агню» як усёачышчальнай боскай сілы універсальны ў гісторыі рэлігій. Успомнім біблейскае «Бог ёсць агонь, які паядае...» Таксама згодна з ісламам, агонь ляжыць у аснове Сусвету. Агні Ёга трактуе гэты агонь як энергію, што разліта ў кожным атаме космасу і сканцэнтравана ў чалавеку. Цяперашні стан Зямлі ў Агні Ёзе параўноўваецца з цяжкай хваробай, а рэакцыя космасу — з хірургічнай аперацыяй, у выніку якой будуць захаваны здаровыя органы і выдалены хворыя. Энергія агню заклікана спыніць на планеце разбуральныя тэндэнцыі і ачысціць яе ад усіх відаў назапашанага за доўгую гісторыю зла — ад тэхнагенных пралікаў да яго агрэсіўнай эгаістычнай псіхалогіі. Агні Ёга сцвярджае, што вогненная энергія, калі свядома ўспрымаецца людзьмі, ператвараецца ў іх духоўную сілу, якая забяспечвае працэсы эвалюцыі.

Агні Ёгу нельга звесці ні да навукі ў яе традыцыйнай форме, ні да рэлігіі. Не трэба разглядаць яе і як зборнік экзатычных легенд і жыццёвых павучанняў. Яшчэ больш да месца ставіць яе ў адзін шэраг з навейшай мадэрнізацыяй класічных школ ёгі. Жывая Этыка сінтызуе старажытную мудрасць Усходу з навукова-філасофскімі дасягненнямі сучаснасці і па багацыю канкрэтных прыёмаў і метадаў работы чалавека над сабой можа называцца сапраўды энцыклапедыяй удасканальвання духу.

У Агні Ёзе закладзены прынцып спіралі — пастаяннага паглыбення і пашырэння тэм і паняццяў ад першай кнігі Вучэння «Кліч» да наступных. Раздзяленне на параграфы, кожны з якіх нібы самастойнае цэлае і ў той жа час звяно адзінага ланцуга, з'яўляецца натуральным падштурхоўваннем да пытання чарговага фрагмента. Паглыбленае засваенне тэкстаў Жывой Этыкі абавязкова павінна суправаджацца прыкладваннем яе да паўсядзённасці — толькі тады пачынае здзяйсняцца ўнутраная трансфармацыя духоўнага ўзыходжання, якая характарызуецца трыма ступенямі: ачышчэннем, пашырэннем і патанчэннем свядомасці. Краеугольнае паняцце Агні Ёгі — псіхічная энергія, якая называецца таксама вогненнай. Яна не проста сімвал неўтаймаванай чалавечай волі да ўдасканальвання, але згодна з Вучэннем, аб'ектыўна існуючы від энергіі. Энергаабмен паміж вышэйшым і ніжэйшым узроўнямі светабудовы — галоўны рухавік эвалюцыі. Агонь мае касмічную прыроду і дзейнічае ў чалавеку як праява першапачатковай сілы, што пранізвае кожны атам сусвету. Значэнне псіхічнай энергіі — чалавечай думкі і дзейнасці — у тым, што яна з'яўляецца самым вялікім стваральным фактарам. Наіўнае пакланенне агню, язычніцкая павага да магутнай стыхіі агню тлумачыцца проста: бояззю. Аднак у светапоглядах старажытных вучоных сустракаюцца думкі, што космас не стварыў ніхто ні з багоў, ні з людзей, ён заўсёды быў, ёсць і будзе вечна жывым агнём. Геракліт, напрыклад, лічыў, што ўсе рэчы ўзнікаюць з агню шляхам згушчэння, а потым вяртаюцца да першакрыніцы шляхам разрэджвання. Двайная назва вучэння Жывой Этыкі — Агні Ёга — указвае на галоўныя напрамкі чалавечага ўдасканальвання. Этычнае, маральнае ператварэнне і авалодванне псіхічнай энергіяй. Любы маральны рух душы чалавека ў бок паляпшэння падмацоўваецца магутнымі псіхаэнергетычнымі імпульсамі, таму дабро, якое стварае сапраўдны агні ёг, заўсёды трывалае і жыццяздольнае.

Спалучальным звяном паміж этыкай і псіхаэнергетыкай, згодна з Агні Ёгай, з'яўляецца чалавечая думка. Спалучаючы высокую творчасць і маральныя эмоцыі, думка можа дасягаць выключнай магутнасці, уплываць нават на сусветныя падзеі. Думкі як тонкаматэрыяльныя ўтварэнні ствараюць духоўную абалонку планеты. Сучасны чалавек рэдка думае пра высокае і чыстае, і калектыўна безадказныя адносіны да мыслення садзейнічаюць удушлівай псіхічнай атмасферы, якую інакш завуць духоўным вакуумам. Любімае выказванне А. І. Рэрых — «Думкі кіруюць светам». Запавет надыходзячай новай эры — у тым, каб мысліць не вузка-асабова, а прасторава, укладаючы свае думкі-вобразы ў агульную наасферу, сферу працы і думкі, па вызначэнню Вернадскага.

Вучэнне надае значнае месца космасу. Яшчэ адна з важнейшых эвалюцыйных задач чалавека, што сфармулявана ў Жывой Этыцы,— выхаванне касмічнай свядомасці. Фізічны свет і біялагічныя формы жыцця не з'яўляюцца адзінымі ў бясконцым сусвеце, у чалавека ёсць іншыя перспектывы, іншыя эвалюцыйныя магчымасці. Сэнс нашага жыцця ў канчатковым выніку — у набліжэнні да касмічнай бясконцасці, у спасціжэнні іншых форм матэрыі, у пазнанні іншых вымярэнняў. Вучэнне вызначае іх як Тонкі (звязаны з пачуццямі) і Вогненны, што пранізвае думкі і дух, Светы.

Грознае дыханне космасу накладае на паводзіны чалавека асаблівую адказнасць. Усё хворае, што аслабела ў выніку няправільнага ладу жыцця, павінна сыйсці з планеты, такое патрабаванне эвалюцыі, яе новага вітка. Адзіная абарона ў гэтай сітуацыі — маральнае здароўе, чысціня намераў, павышэнне псіхаэнергетычнага патэнцыялу. Чалавек павінен абясшкодзіць сябе ад прасторавага агню — дзякуючы запаленаму агню ўласнага сэрца.

Галоўным метадам духоўнай работы, здольным наблізіць недасканалую душу да прасвятлення, Жывая Этыка лічыць канцэнтрацыю на выбраным Вышэйшым Ідэале і няўхільнае імкненне ўзняцца да Яго. А. І. Рэрых папярэджвае: «Настаўнік чакае толькі таго, хто ідзе цвёрда, хто непахісны ў сваім усепаглынаючым імкненні...» Сярод якасцей, якія неабходны для будаўніцтва Новага свету А. І. Рэрых вылучае ўменне працаваць, цаніць час, жаданне дапамагчы без сумненняў, адмову ад уласнасці, а таксама прастату, смеласць, добразычлівасць, мужнасць, сумленне, спагаду. Як аснова духоўнасці ў Жывой Этыцы вызначаюцца адданасць ідэалам святла, любві. Спаліць у агні трэба такія памкненні, як «найперш энергія эгаізму гэтага лютага дракона з усім яго хвастом — ганарлівасцю, уладалюбствам, сябелюбствам, крыўдлівасцю, раздражнёнасцю і таму падобнымі «ўпрыгожваннямі», замяніць іх крыламі поўнай салідарнасці і адзінства з іншымі людзьмі...»

Гаворачы аб раскрыцці псіхаэнергетычнага патэнцыялу чалавека, Агні Ёга ў той жа час крытыкуе захапленне магіяй і іншымі чыста механічнымі метадамі абуджэння схаваных сіл. Небяспека гэтага шляху ў паступовай страце ўнутранай раўнавагі і маральнага здароўя. Чалавек становіцца рабом штучна выкліканых, невядомых яму сіл і рызыкуе ператварыцца ў бязвольнага медыума. Перш чым развіць свае схаваныя сілы, неабходна ачысціць думкі і памкненні, скіраваць іх на паляпшэнне рэальнага жыцця, клопат пра другіх людзей.

У духоўнай працы над сабой, ва ўсёй дзейнасці чалавека Агні Ёга арыентуе яго на бясстрашнасць і гатоўнасць да пераадолення перашкод. Вучэнне прапаноўвае пераглядзець адносіны да цяжкасцей. Праз усе кнігі Жывой Этыкі стрыжнем праходзіць дэвіз: «Благаславёны перашкоды, імі расцём». Гаворка ідзе і аб знешніх, і аб унутраных, асабасных перашкодах, і аб супраціўленні так званым цёмным сілам. Агні Ёга раіць не памяншаць маштаб і магутнасць цёмных сіл, згодна з ёй галоўная прыкмета, якая ў сапраўднасці адпавядае эвалюцыйнаму прызначэнню чалавека,— прынцып святлацені. Вучэнне абвяшчае непазбежную канчатковую перамогу Святла.

Важна падкрэсліць, што Жывая Этыка заклікае ўсю работу па ўнутранай трансфармацыі свайго характару і сваёй свядомасці весці ў рамках звычайнага жыцця, без акдключэння ад знешняй дзейнасці. Новая ёга настойвае на строгім выкананні кожным сваіх абавязкаў і доўгу ў адносінах да тых, хто знаходзіцца побач. Духоўная работа павінна ісці не адасоблена, а паралельна з практычным жыццём.

Вялікае месца ў Жывой Этыцы займае паняцце Прыроды і праблема ўстанаўлення гарманічных узаемаадносін з ёй. У нейкім сэнсе таму Вучэнне нагадвае працяг традыцый натурфіласофіі. Прырода і дух у ім выступаюць як дзве ўзаемадапаўняючыя сутнасці, якія ў адзінстве складаюць цэласнасць свету. Вялікая Прырода, Маці і стваральніца, разглядаецца ў Вучэнні як пачатак, які немагчыма ўдасканаліць. Пры духоўных імкненнях ігнараванне жыватворных сіл Прыроды непазбежна робіць духоўныя пошукі бясплоднымі. Асабліва гэта датычыць жыхароў вялікіх гарадоў, чый арганізм мае вострую патрэбу пры ўзыходжанні да духоўнасці ў харчаванні тонкімі прыроднымі энергіямі. Толькі ціплыя, з глыбокай павагай адносіны да Прыроды і вывучэнне яе законаў дапамогуць чалавеку ў эвалюцыі духу. Утварэнню пустыні прыроднай папярэднічае пустыня душэўная. Агні Ёга дае вельмі суровыя прагнозы экалагічнай будучыні планеты: нават калі чалавецтва спыніць разбуральніцкую дзейнасць у адносінах да Прыроды, усё роўна спатрэбіцца дзесяткі гадоў, каб аздаравіць кару планеты. І росквіт дзяржавы залежыць ад таго, наколькі правільна эканамічныя навукі ўлічваюць прыродны фактар і наколькі беражліва дзяржава ставіцца да Прыроды: «Палітычная эканомія павінна пачынацца з выяўлення каштоўнасцей Прыроды і разумнага іх выкарыстання, інакш дзяржава апыніцца на пяску».

Праблема ўзаемаадносін духу і прыроды ў Агні Ёзе разглядаецца з пазіцый касмічнага закона раўнавагі двух пачаткаў — мужчынскага, які ўяўляе сабой Дух, і жаночага, які адказны за стварэнне форм і ўзыходзіць да Вялікай Прыроды, матэрыі. Яднаючыся, Дух і Матэрыя спыняюць існаванне ў папярэднім выглядзе і складаюць далей непадзельнае — Абсалют, пачатак і канец сусвету. Каб любы касмічны працэс праходзіў паспяхова, мужчынскі і жаночы пачаткі павінны знаходзіцца ў гармоніі і раўнавазе. Парушэнне гэтага закона людзьмі, у прыватнасці, духоўнае зняволенне і прыніжэнне жанчыны прывяло да перамогі жорсткасці, агрубления нораваў, збяднення духу. Менавіта таму Агні Ёга, якая надае вялізнае значэнне адраджэнню жаночай духоўнасці, можа быць вызначана як Вучэнне аб Маці Свету.

Па матэрыялах
друку падрыхтавала
А. ЦЯРЭНЦЬЕВА.

Нарыс аб жыцці і творчасці А. І. Рэрых змешчаны цалкам у кнізе С. Ю. Ключнікава «Провозвестница Эпохи Огня» (Омск, 1991 г.). Для тых, хто хацеў бы набыць гэта ўнікальнае выданне, паведамляем: кніга дасылаецца накладной платай. Дасылайце заяўкі на паштоўках з указаннем колькасці экземпляраў, дакладнага адрасу, прозвішча, імя і імя па бацьку заказчыка на адрас: 644048, Омск-48, а/я 4024, МП «Геліос».

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 5 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВІПА імя Я. Коласа.

12 снежня
Зак. 2082—2083.
Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.